**УДК 94:378.2(410)**

# АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ ДАКТАРАНТАЎ-ГІСТОРЫКАЎ ВА ЎНІВЕРСІТЭТАХ ШАТЛАНДЫІ І УЭЛЬСА Ў ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

***А.А. ДЗЕНІСЕВІЧ***
***(Рэспубліканскі Інстытут Вышэйшай Школы, Мінск)***

*Разглядаюцца асаблівасці прафесійнай падрыхтоўкі дактарантаў-гісторыкаў ва ўніверсітэтах Шатландыі і Уэльса. Апісаны галоўныя напрамкі даследаванняў шатландскіх і валійскіх дактарантаў у пачатку XXI стагоддзя.*

***Ключавыя словы**: гісторыя, гістарычная адукацыя, Балонскі працэс, дактарантура, універсітэты, Уэльс, Шатландыя.*

Англа-саксонская сістэма падрыхтоўкі навуковых кадраў узята за аснову для балонскіх рэкамендацый, да выканання якіх у 2015 годзе далучылася Рэспубліка Беларусь. Брытанская мадэль падрыхтоўкі дактарантаў у галіне гісторыі ва ўмовах Балонскага працэсу прадстаўляе вялікі інтарэс для беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі. У адрозненне ад прынятай у нашай краіне двухузроўневай сістэмы прысваення навуковых ступеняў (кандыдат и доктар навук) у англа-саксонскай існуе толькі адна навуковая ступень – PhD, альбо доктар навук. Брытанскія ўніверсітэты з'яўляюцца галоўнымі цэнтрамі не толькі навуковых даследаванняў, але і падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У артыкуле будуць разгледжаны асаблівасці прафесійнай падрыхтоўкі дактарантаў на прыкладзе PhD праграм па гісторыі ва ўніверсітэтах Шатландыі і Уэльса.

Неабходна падкрэсліць, што паступаць у дактарантуру ў Вялікабрытаніі могуць асобы, якія атрымалі магістарскую гістарычную адукацыю па навучальнай (“taught programme”) або даследчай (“research programme”) праграме. Магістранты навучальнай праграмы вывучаюць вучэбныя модулі і пішуць дысертацыю. Даследчая магістарская праграма прызначана для асоб, якія мэтанакіравана вырашылі стаць вучонымі, і прадугледжвае толькі напісанне дысертацыі ў аб'еме ў 2–3 разы больш, чым для магістрантаў навучальнай праграмы. Як правіла, у Вялікабрытаніі менавіта выпускнікі даследчай магістарскай праграмы працягваюць далей займацца навуковымі даследаваннямі ў дактарантуры.

Вельмі важна разгледзець працэс падачы заяўкі ў брытанскую дактарантуру. Усе кандыдаты павінны направіць у дактарантуру ўніверсітэта наступныя дакументы: заяўку на паступленне, заяўку на атрыманне стыпендыі, “план даследавання” (“research proposal”), копію магістарскага дыплома, 2 рэкамендацыйных пісьма ад вядучых спецыялістаў у галіне меркаванага напрамку навучання дактаранта. Замежныя кандыдаты павінны прадставіць сертыфікат, які падцвярджае высокі ўзровень валодання англійскай або валійскай мовай (IELTS, TOEFL). Пасля разгляду заяўкі ўніверсітэт запрашае кандыдата на сумоўе, па выніках якога ен можа быць залічаны ў дактарантуру.

На пачатак 2017 года прафесійную падрыхтоўку дактарантаў у галіне гісторыі забяспечвалі 9 шатландскіх універсітэтаў: Абердын, Глазга, Дандзі, Каледонскі ўніверсітэт Глазга, Стэрлінг, Стратклайд, Сэнт-Эндрус, універсітэт Паўночна-Шатландскага нагор'я і астраваў, Эдынбург. Ва Уэльсе падрыхтоўка дактарантаў-гісторыкаў арганізавана ў 5 універсітэтах: Аберыстуіце, Бангоры, Кардыфе, Суонсі, універсітэце Уэльса Святой Тройцы і Святога Давіда. Усе вышэйпералічаныя шатландскія і валійскія ўніверсітэты забяспечваюць падрыхтоўку дактарантаў у галіне гісторыі, як у дзеннай, так і ў завочнай форме. Тэрмін падрыхтоўкі ў дзеннай форме складае 3 гады, у завочнай – 4–6 год. Але есць выключэнне. У Бангорскім універсітэце дактаранты, якія маюць двухгадовы вопыт працы, могуць атрымаць доктарскую ступень за два гады навучання на дзенным аддзяленні [11]. Выпускнікам дактарантуры ў Шатландыі і Уэльсе прысвайваюць навуковую ступень “доктар філасофіі” (“Doctor of Philosophy”). Шатландская доктарская ступень адпавядае 12 узроўню Шатландскай рамкі крэдытаў і кваліфікацый (SCQF) і 6 узроўню Еўрапейскай рамкі кваліфікацый (EQF) [8, p. 5; 27]. Валійская ступень доктара філасофіі адпавядае 8 узроўню Валійскай рамкі крэдытаў і кваліфікацый (CQFW) і 8 узроўню EQF [5, p. 18; 8, p. 5].

Доктарская гістарычная праграмма ў Шатландыі і Уэльсе мае свае асаблівасці. У шатландскіх і валійскіх універсітэтах падрыхтоўку дактарантаў-гісторыкаў забяспечваюць гістарычныя факультэты, школы гісторыі і інстытуты. Асноўнае месца ў доктарскай гістарычнай праграме адведзена падрыхтоўке і напісанню дактарантам дысертацыі. Аб'ем дысертацыі для шатландскіх дактарантаў складае ад 70 000 да 100 000 слоў, для валійскіх дактарантаў – ад 80 000 да 100 000 слоў. Дактарант выконвае дысертацыйнае даследаванне пад кіраўніцтвам двух навуковых кіраўнікоў. Для праходжання штогадовай атэстацыі дактарант абавязаны прадставіць частку дысертацыі (як правіла, 1 главу) на разгляд спецыяльнай камісіі. Абарона доктарскай дысертацыі адбываецца на вусным экзамене (“viva voce”).

Неабходна адзначыць, што некаторыя PhD праграмы па гісторыі прадугледжваюць абавязковае вывучэнне дактарантамі вучэбных курсаў (модуляў). За вывучэнне гэтых курсаў шатландскім і валійскім дактарантам-гісторыкам налічаюцца заліковыя адзінкі – крэдыты. Як правіла, адзін модуль ацэньваецца 20 крэдытамі. Формы кантролю ведаў па такіх модулях – эсэ, прэзентацыя, даклад, невялікія пісьмовыя заданні. У Эдынбургскім універсітэце PhD праграма па гісторыі прадугледжвае вывучэнне дактарантам на першым курсе двух абавязковых модуляў “Напісанне гісторыі: тэорыя і практыка” і “Семінар па доктарскай дысертацыі ў галіне гісторыі”. Першы вучэбны модуль рыхтуе дактаранта да працы над дысертацыяй. Ен прымушае дактаранта задумацца аб важных пытаннях, звязаных з напісаннем гісторыі: эпістэмалогіяй гістарычнай дысцыпліны ў мінулым і сучаснасці, метадах адбору і інтэрпрэтацыі крыніц, механікай пабудовы гістарычнага агрументу [20]. Другі вучэбны модуль накіраваны на развіцце ў дактаранта-гісторыка вусных прэзентацыйных навыкаў і ўменняў прапаноўваць карысныя водгукі на навуковым і прафесійным узроўні. Модуль абавязвае дактаранта падрыхтаваць даклад у аб’еме 20 старонак і прэзентацыю, таксама выступіць на спецыяльным семінары перад іншымі дактарантамі [22]. Ва ўніверсітэце Аберыстуіта дактаранты-гісторыкі на першым курсе павінны вывучыць вучэбных модуляў у аб’еме 40 валійскіх крэдытаў. У 2017 годзе ва Аберыстуіцкім універсітэце дактарантам-гісторыкам прапаноўваліся для вывучэння модулі “Навыкі даследавання і асабістае развіццё”, “Методыкі чытання”, “Прынцыпы даследчага праектавання”. Гэтыя модулі накіраваны на развіццё ў дактаранта-гісторыка навыкаў даследавання і працы з гістарычнымі крыніцамі. Заняткі з дактарантамі ў Аберыстуіце арганізаваны ў форме семінараў [16]. Неабходна адзначыць, што дактаранты-гісторыкі шатландскіх і валійскіх універсітэтаў акрамя напісання дысертацыі таксама ўдзельнічаюць у навуковых семінарах і канферэнцыях. Некаторыя доктарскія праграмы дазваляюць дактаранту-гісторыку атрымаць выкладчыцкі вопыт. Напрыклад, ва ўніверсітэце Суонсі дактаранты, якія займаюцца вывучэннем гісторыі ЗША, пачынаючы з другога курса маюць права праводзіць семінарскія і цьютарскія заняткі са студэнтамі бакалаўрыята [1].

Неабходна адзначыць, што ва ўніверсітэце Абердына тэрмін падрыхтоўкі ў дактарантуры можа быць павялічаны на 1 год. Дактаранты-гісторыкі, якія не маюць вялікага вопыту даследчай працы і якім неабходна навучыцца спецыяльным навыкам, могуць прайсці навучанне па праграме “пашыранага доктара філасофіі” (“Extended PhD”). Падчас дадатковага года дактарант-гісторык у Абердынскім універсітэце можа вывучыць грэчаскую, лацінскую і нямецкую мовы і атрымаць веды па палеаграфіі.

PhD праграма па гісторыі ва ўніверсітэце Стратклайда дазваляе дактарантам атрымаць акрамя навуковай ступені доктара яшчэ і дадатковую кваліфікацыю. Усе асобы, якія паступаюць у дактарантуру Стратклайда, аўтаматычна залічаюцца таксама і на праграму навучання “Даследчая праграма прафесійнага развіцця” (“Researcher Professional Development Programme”). Гэта праграма была створана для павелічэння канкурэнтаздольнасці выпускнікоў дактарантуры на рынку працы. Па выніках навучання дактаранту прысвойваецца “Паслядэпломны сертыфікат па даследчай праграме прафесійнага развіцця” (“Postgraduate Certificate in RPD”) [21].

Вельмі важна разгледзець асноўныя напрамкі даследаванняў, якія праводзяцца дактарантамі-гісторыкамі ў шатландскіх і валійскіх універсітэтах. На сучасным этапе лідарам сярод шатландскіх універсітэтаў па якасці падрыхтоўкі дактарантаў-гісторыкаў з’яўляецца ўніверсітэт Сэнт-Эндруса. На пачатак 2017 года ў школе гісторыі Сэнт-Эндруса налічвалася 100 дактарантаў [23, p. 75]. У канцы XX – пачатку XXI стагоддзя адным з асноўных накірункаў даследаванняў дактарантаў Сэнт-Эндруса з’яўлялася вывучэнне гісторыі Шатландыі. У перыяд з 1998 па 2017 гады ў Сэнт-Эндрусе было абаронена 38 доктарскіх дысертацый, прысвечаных шатландскай гісторыі [13]. У 2007 годзе ў складзе Сэнт-Эндрускага ўніверсітэта быў створаны Інстытут шатландскіх гістарычных даследаванняў. Гэты інстытут з’яўляецца адным з найбуйнейшых навуковых цэнтраў у Вялікабрытаніі па вывучэнню шатландскай гісторыі. Сэнт-Эндрус – буйны цэнтр па падрыхтоўцы дактарантаў-медыявістаў. Яшчэ ў 1955 годзе ва ўніверсітэце быў створаны дэпартамент сярэднявечнай гісторыі, а ў 2007 годзе – Інстытут сярэднявечных даследаванняў. На пачатак 2017 года ў Сэнт-Эндрусе вывучэннем сярэднявечнай гісторыі займаўся 41 дактарант [6]. Неабходна адзначыць, што ў 2000-я гады многія дактаранты Сэнт-Эндруса зацікавіліся гісторыяй Францыі. У 2005 годзе ва ўніверсітэце быў створаны Цэнтр французскай гісторыі і культуры. Універсітэт Сэнт-Эндруса наладзіў сувязі з Інстытутам Напалеона і Французскай Рэвалюцыі Універсітэта штата Флорыда (ЗША), Цэнтрам даследаванняў Рэнесансу ва ўніверсітэце імя Франсуа Рабле (Тур, Францыя) [3].

Эдынбургскі ўніверсітэт – адзін з вядучых навуковых цэнтраў у Вялікабрытаніі па падрыхтоўцы дактарантаў у галіне Позняй Антычнасці і гісторыі Візантыі. Па дадзеных на лістапад 2016 года вывучэннем старажытнай гісторыі і гісторыі Візантыі ва ўніверсітэце Эдынбурга займалася 16 дактарантаў [15]. З 1884 года ў Эдынбургу вывучаецца эканамічная гісторыя. У канцы 2016 года ва ўніверсітэце налічвалася 14 дактарантаў, якія вывучалі сацыяльна-эканамічную гісторыю Шатландыі і Вялікабрытаніі [7]. Эдынбург – адзін з сусветных лідараў па вывучэнню гісторыі Ірландыі ў перыяд Новага часу.

У канцы 2016 года ва ўніверсітэце налічвалася 10 дактарантаў, якія займаліся даследаваннямі ірландскай гісторыі ў перыяд 1800–1921 гады [14].

Цэнтр гісторыі ўніверсітэта Паўночна-Шатландскага нагор'я і астраваў – самы малады сярод шатландскіх гістарычных дэпартаментаў. Ен быў створаны ў 2005 годзе. Дактаранты Цэнтра праводзяць даследаванні ў галіне палітычнай, эканамічнай, рэлігійнай гісторыі Паўночна-Шатландскага нагор'я і астраваў. У перыяд з 2009 па 2017 гады Цэнтр падрыхтаваў 3 дактароў навук. Дзве дысертацыі былі прысвечаны рэлігійнай гісторыі. Дарэн Цірні прысвяціў сваё даследаванне гісторыі каталіцызму ў Шатландыі ў XIX стагоддзі, а Боб Чэмберс вывучаў міжканфесійныя адносіны насельніцтва вострава Скай і Знешніх Гебрыдскіх астраваў. Трэцяя доктарская дысертацыя была абаронена Давідам Тэйларам. Яна была прысвечана сацыяльна-эканамічнай гісторыі рэгіёну Бадэнох у другой палове XVIII стагоддзя. На сучасным этапе дактаранты Цэнтра праводзяць даследаванні, прысвечаныя вывучэнню гісторыі аховы здароўя, спорта і культуры на тэрыторыі Паўночна-Шатландскага нагор'я і астраваў [4].

У Абердынскім універсітэце асноўнымі напрамкамі даследаванняў дактарантаў з'яўляліся: гісторыя Скандынавіі, гісторыя Шатландыі ў перыяд сярэднявечча, Шатландыя і Ірландыя ў эпоху Асветніцтва, Шатландыя ў перыяд 1688–1832 гадоў, гісторыя каталіцкай царквы ў Шатландыі з 1707 года, гісторыя Ірландыі ў перыяд Новага часу, гісторыя Брытаніі ад Сярэднявечча да сучаснасці. Па дадзеных на пачатак 2017 года ў Абердзіне 9 дактарантаў даследвалі гісторыю Скандынавіі, 4 – гісторыю Шатландыі, 3 – гісторыю Вялікабрытаніі, 1 – гісторыю Ірландыі, 1 – гісторыю ВКЛ, 1 – гісторыю Лівоніі, 1 – гісторыю Германіі, 1 – гісторыю Кітая. Сярод дактарантаў-гісторыкаў Абердзіна неабходна вылучыць беларускага даследчыка Ганну Мажэйка. Яна з'яўляецца выпускніком БДПУ імя М. Танка. У 2008 /2009 гадах яна атрымала магістарскую адукацыю па стыпендыяльнай праграмме "Chevening" ва ўніверсітэце Уорыка (горад Ковентры, Вялікабрытанія). З 2013 года Ганна Мажэйка з'яўляецца дактарантам Абердзінскага ўніверсітэта. Яна даследуе гісторыю ВКЛ і Брытаніі. Тэма яе доктарскай дысертацыі – "Канфесійныя кантакты і міграцыя паміж Брытаніяй і ВКЛ у Ранні Новы час [10].

У 2000-я гады большасць дактарантаў універсітэта Стэрлінга прысвяцілі свае даследаванні вывучэнню гісторыі Шатландыі. Дактарантаў Стэрлінга асабліва зацікавілі замкі Шатландыі ў XI–XIV стагоддзях, гісторыя абацтваў Дамферлайн і Скун, гендерная гісторыя Шатландыі ў XIX стагоддзі. На пачатак 2017 года ў Стэрлінге налічвалася 36 дактарантаў, з якіх 21 займаўся вывучэннем шатландскай гісторыі [25]. На сучасным этапе ў Стэрлінге актыўна развіваюцца даследаванні па гісторыі ЗША, Францыі, Германіі, Афрыканскага кантынента.

Каледонскім універсітэтам Глазга сумесна з Цэнрам сацыяльнай гісторыі здароўя і аховы здароўя ўніверсітэта Стратклайда арганізавана падрыхтоўка дактарантаў у галіне гісторыі медыцыны і аховы здароўя. Па дадзеных на пачатак 2017 года даследаваннямі па медыцынскай гісторыі займаліся 14 дактарантаў [17]. Доктарскія даследаванні былі прысвечаны гісторыі дыябету ў Вялікабрытаніі і ЗША ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя, гісторыі спажывання алкаголю насельніцтвам Вялікабрытаніі ў 1869–1914 гадах, гісторыі наркаманіі ў краінах Паўднёвай і Усходняй Азіі ў першай палове XX стагоддзя.

Дэпартамент гісторыі ўніверсітэта Дандзі з'яўляецца членам міжнароднай праграмы падрыхтоўкі дактарантаў у галіне гендэрнай гісторыі. Усе дактаранты Дандзі, якія вывучаюць гендэрную гісторыю, абавязаны прайсці навуковую стажыроўку ў замежным універсітэце працягласцю 1 семестр (6 месяцаў). Дэпартамент гісторыі ўніверсітэта Дандзі наладзіў сувязі з універсітэтамі Італіі, Францыі, Аўстрыі, Іспаніі. Акрамя гендернай гісторыі дактаранты Дандзі праводзяць даследаванні ў галіне брытанскай, еўрапейскай і амерыканскай гісторыі [12].

Ва ўніверсітэце Глазга прафесійная падрыхтоўка дактарантаў-гісторыкаў арганізавана па наступных напрамках: рэлігія і палітыка ў Рымскай рэспубліцы, гісторыя Італіі пад уладай остготаў, гісторыя Еўропы ў перыяд Сярэднявечча, гісторыя Шатландыі, Ірландыі, Вялікабрытаніі, ЗША, сацыяльная і гендэрная гісторыя [24].

Асаблівай увагі заслугоўваюць даследаванні дактарантаў валійскіх універсітэтаў. На сённяшні дзень адным з галоўных цэнтраў падрыхтоўкі навуковых кадраў у галіне гістарычнай навукі ва Уэльсе з'яўляецца ўніверсітэт Аберыстуіта. Гісторыя вывучаецца ў Аберыстуіце з моманту заснавання ўніверсітэта ў 1872 годзе. На сучасным этапе падрыхтоўка дактарантаў ва ўніверсітэце арганізавана дэпартаментам гісторыі і валійскай гісторыі. Па дадзеных на пачатак 2017 года ў Аберыстуіце налічваўся 21 дактарант: 7 займаліся даследаваннямі гісторыі Вялікабрытаніі, 6 – гісторыяй Сярэднявечнай Еўропы (Англія, Германія, Нармандыя), 4 – гісторыяй Уэльса, 2 – гісторыяй Ірландыі, 1 – гісторыяй Еўропы ў Новы час, 1 – гісторыяй Славакіі [26, p. 21]. Важна падкрэсліць, што ў апошнія гады дактарантамі Аберыстуіта былі падрыхтаваны дысертацыі, прысвечаныя вывучэнню ўплыву Вялікай французскай рэвалюцыі на Уэльс, Англію, Шатландыю і Ірландыю ў XIX стагоддзі.

Ва ўніверсітэце Кардыфа падрыхтоўка дактарантаў-гісторыкаў арганізавана школай гісторыі, археалогіі і рэлігіязнаўства. У перыяд з 2002 па 2017 гады школай падрыхтавана 120 дактароў-гісторыкаў

[18]. У 2002–2017 гадах дактарантамі Кардыфа было падрыхтавана 35 дысертацый па гісторыі Старажытнага свету. Дактарантаў зацікавалі не толькі гісторыя Старажытнай Грэцыі і Рыма, але і гісторыя Егіпта, Індыі, Брытаніі, Ірландыі, Францыі, Германіі. Важным напрамкам даследаванняў дактарантаў Кардыфа ў 2002–2017 гадах з'яўлялася гісторыя Уэльса. За гэты перыяд у Кардыфе было падрыхтавана 26 доктарскіх даследаванняў па самых розных аспектах валійскай гісторыі: стварэнне і развіццё нацыянальных музеяў ва Уэльсе, англіканская царква ва Уэльсе, валійцы на тэрыторыі Ірландыі ў другой палове XVI – пачатку XVII стагоддзя, развіццё адносін паміж Уэльсам і Францыяй у XII–XV стагоддзях, валійская прэса ў Валійскай Патагоніі (Аргенціна) у другой палове XIX – першай трэці XX стагоддзя, антываенны рух ва Уэльсе ў гады Першай сусветнай вайны [18]. У пачатку XXI стагоддзя ў Кардыфе актыўна развіваюцца даследаванні па гісторыі Сярэднявечнай Еўропы. Дактарантамі Кардыфа былі падрыхтаваны дысертацыі, прысвечаныя гісторыі крыжовых паходаў, дзейнасці Ордэна Святога Яна ў Сярэднявечнай Брытаніі і Ірландыі, гісторыі Сіцылійскага каралеўства.

На сучасным этапе самым буйным цэнтрам амерыканскіх даследаванняў ва Уэльсе з'яўляецца ўніверсітэт Суонсі. Дактаранты ўніверсітэта займаюцца вывучэннем розных аспектаў гісторыі ЗША: грамадзянская вайна ў ЗША, знешняя палітыка ЗША, праблема наркагандлю ў ЗША, гісторыя амерыканскай літаратуры, кінаіндустрыі, поп-культуры ў XX стагоддзі [1]. Важна падкрэсліць, што ў Суонсі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя актыўна праводзіліся даследаванні па гісторыі Старажытнага Егіпта. У 1998 годзе ва ўніверсітэце быў створаны Цэнтр Егіпта. На сённяшні дзень у гэтым цэнтры захоўваецца самая вялікая ва Уэльсе калекцыя егіпецкіх артыфактаў, якая налічвае 3 000 асобнікаў [9].

Ва ўніверсітэце Бангора падрыхтоўку дактарантаў-гісторыкаў забяспечвае школа гісторыі, валійскай гісторыі і археалогіі. У перыяд з 1999 па 2017 гады школай было падрыхтавана 25 дактароў навук [19]. Найбольшая колькасць даследаванняў была прысвечана гісторыі Уэльса. За названы перыяд у Бангоры было падрыхтавана 13 доктарскіх даследаванняў па розных напрамках валійскай гісторыі: асаблівасці пахавальных абрадаў ва Уэльсе ў рымскі перыяд, раннехрысціянскія надпісы ва Уэльсе, гендэрная гісторыя Уэльса ў XII–XIII стагоддзях, асаблівасці адміністрацыйнага кіравання і сістэма адукацыі на востраве Англсі, палітыка Лейбарысцкай партыі на тэрыторыі Уэльса [19].

У пачатку XXI стагоддзя дактарантамі ўніверсітэта Уэльса Святой Тройцы і Святога Давіда праводзяцца даследаванні ў галіне старажытнай гісторыі, археалогіі, антрапалогіі, брытанскай і валійскай гісторыі. Вялікай папулярнасцю ў дактарантаў універсітэта карысталася гісторыя Старажытнага света. Дактаранты ўніверсітэта вывучалі эканоміку Старажытнай Грэцыі, становішча габрэяў у Рымскай імперыі, старажытнагрэцкую і старажытнарымскую літаратуру, гістарыяграфію гісторыі Старажытнага Рыма [2]. Важным напрамкам даследаванняў дактарантаў універсітэта з'яўляецца гісторыя Брытаніі. Асноўныя напрамкі даследаванняў: царква ў Брытаніі ў XI і XIV стагоддзях, сацыяльная гісторыя Брытаніі з 1660 года, гісторыя гарадоў Брытаніі ў 1660–1800 гадах, гісторыя Брытанскай імперыі, гісторыя Вялікабрытаніі ў XIX–XX стагоддзях. У апошнія гады ва ўніверсітэце актыўна даследуецца сярэднявечная валійская літаратура, гісторыя Уэльса ў 1700–1900 гадах, нацыяльнальная ідэнтычнасць ва Ульсе і Англіі.

Такім чынам, у пачатку XXI стагоддзя шатландскімі і валійскімі ўніверсітэтамі забяспечваецца падрыхтоўка дактарантаў-гісторыкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі Балонскай сістэмы. Ва ўніверсітэтах Шатландыі і Уэльса падрыхтоўку дактарантаў-гісторыкаў забяспечваюць гістарычныя школы, дэпартаменты або інстытуты. Доктарская гістарычная праграма ў Шатландыі і Уэльсе прадугледжвае не толькі напісанне дактарантам дысертацыі, але і ўдзел у навуковых семінарах і канферэнцыях. Некаторыя PhD праграмы па гісторыі абавязваюць дактарантаў вывучыць вучэбныя модулі. У пачатку XXI стагоддзя шатландскімі і валійскімі дактарантамі было падрыхтавана мноства даследаванняў, прысвечаных гісторыі Шатландыі, Уэльса, Ірландыі, Вялікабрытаніі, ЗША, Старажытнай Грэцыі, Рыма і Егіпта.

ЛІТАРАТУРА

1. American Studies (PhD/MPhil) [Электронны рэсурс] // Swansea University. – Рэжым доступу: http://www.swansea.ac.uk/postgraduate/research/arts-and-humanities/phd-mphil-american-studies/. – Дата доступу: 22.03.2018.
2. Ancient History (Research). PhD in History. University of Wales Trinity Saint David [Электронны рэсурс] // UCAS. – Рэжым доступу: https://digital.ucas.com/courses/detail s?CoursePrimaryId=26f4dbc7-7ed7-f49c-22a7-641ee7a3f436&CourseOptionId=99ff0f69-9148-41ef-ba04-05c5950628f3. – Дата доступу: 25.03.2018.
3. Centre for French History and Culture. PhD Opportunities [Электронны рэсурс] // University of St. Andrews. Centre for French History and Culture. – Рэжым доступу: http://cfhc.wp.st-andrews.ac.uk/links/. – Дата доступу: 12.07.2017.
4. Centre for History. Current PhD students [Электронны рэсурс] // University of the Highlands and Islands. The Centre for History. – Рэжым доступу: https://www.uhi.ac.uk/en/research-enterprise/cultural/centre-for-history/research/mlitt-by-research-mphil-phd/. – Дата доступу: 28.05.2017.
5. Credit and Qualification Framework for Wales. – January 2017. – 21 p.

6. Current PhD students, Institute of Mediaeval Studies [Электронны рэсурс] // University of St. Andrews. – Рэжым доступу: http://saims.wp.st-andrews.ac.uk/people/current-phd-students/. – Дата доступу: 19.04.2017.
7. Economic and Social History Research Group [Электронны рэсурс] // University of Edinburgh. – Рэжым доступу: https://www.ed.ac.uk/history-classics-archaeology/research/research-groups/economic-and-social-history-research-group. – Дата доступу: 30.06.2017.
8. Education United Kingdom. The British education system described and compared with Dutch system / EP-Nuffic. – 2nd ed, December 2010, version 3, January 2015. – 40 p.
9. Egypt Centre of Swansea University [Электронны рэсурс] // Swansea University. – Рэжым доступу: http://www.egypt.swan.ac.uk/about/history-of-the-egypt-centre/. – Дата доступу: 22.03.2018.
10. History Postgraduates. University of Aberdeen [Электронны рэсурс] // University of Aberdeen. School of Divinity, History and Philosophy. – Рэжым доступу: https://www.abdn.ac.uk/sdhp/postgraduate-experience/history-postgraduates-531.php. – Дата доступу: 01.07.2017.
11. History PhD/MPhil. School of History, Welsh History and Archaeology [Электронны рэсурс] // Bangor University. – Рэжым доступу: https://www.bangor.ac.uk/courses/postgraduate/history-phd-mphil#overview. – Дата доступу: 27.03.2018.
12. History PhD. University of Dundee [Электронны рэсурс] // University of Dundee. – Рэжым доступу: https://www.dundee.ac.uk/study/pg/phds/research-areas/history/. – Дата доступу: 05.07.2017.
13. Institute of Scottish Historical Research [Электронны рэсурс] // University of St. Andrews. – Рэжым доступу: http://ishr.wp.st-andrews.ac.uk/. – Дата доступу: 19.04.2017.
14. Irish History Research Group [Электронны рэсурс] // University of Edinburgh. – Рэжым доступу: http://www.ed.ac.uk/history-classics-archaeology/research/research-groups/irish-history-research-group. – Дата доступу: 30.06.2017.
15. Late Antique and Byzantine Studies Research Group [Электронны рэсурс] // University of Edinburgh – Рэжым доступу: http://www.ed.ac.uk/history-classics-archaeology/research/research-groups/labs. – Дата доступу: 30.06.2017.
16. PhD in History. Study Schemes 2017 [Электронны рэсурс] // Aberystwyth University. – Рэжым доступу: https://www.aber.ac.uk/en/study-schemes/deptcurrent/V1690-PHD/. – Дата доступу: 22.03.2018.
17. PhD students. Centre for the Social History of Health and Healthcare Meet our PhD students [Электронны рэсурс] // University of Strathclyde. Centre for the Social History of Health and Healthcare. – Рэжым доступу: https://www.strath.ac.uk/humanities/schoolofhumanities/histor y/centreforthesocialhistoryofhealthhealthcare/ourphdstudents/. – Дата доступу: 02.07.2017.
18. PhD in History. School of History, Archaeology and Religion. ORCA database [Электронны рэсурс] // Cardiff University. – Рэжым доступу: http://orca.cf.ac.uk/view/complete_schools/SHARE.type.html#group_thesis. – Дата доступу: 24.03.2018.
19. PhD in History. Thesis. School of History, Welsh History and Archaeology [Электронны рэсурс] // Library of Bangor University. – Рэжым доступу: http://e.bangor.ac.uk/view/divisions/History,WelshHistoryandArchaeology/. – Дата доступу: 19.03.2018.
20. Postgraduate Course: Writing History: Theory and Practice [Электронны рэсурс] // University of Edinburgh. – Рэжым доступу: http://www.drps.ed.ac.uk/current/dpt/cxpghc11336.htm. – Дата доступу: 05.07.2017.
21. Postgraduate Certificate in Researcher Professional Development (PG Cert RPD) Programme [Электронны рэсурс] // University of Strathclyde. – Рэжым доступу: https://www.strath.ac.uk/courses/research/history/. – Дата доступу: 05.07.2017.
22. Postgraduate Course: History PhD Dissertation Workshop [Электронны рэсурс] // University of Edinburgh.. – Рэжым доступу: http://www.drps.ed.ac.uk/current/dpt/cxpghc11337.htm. – Дата доступу: 05.07.2017.
23. Postgraduate Prospectus – Research Programmes [Электронны рэсурс] // University of St. Andrews. School of History. – Рэжым доступу: https://www.st-andrews.ac.uk/media/study/documents/pg/prospectus/PGR-Prospectus.pdf. – Дата доступу: 12.04.2017.
24. Postgraduate Research Opportunities. History [Электронны рэсурс] // University of Glasgow. – Рэжым доступу: http://www.gla.ac.uk/research/opportunities/subjects/history/#d.en.316446. – Дата доступу: 05.07.2017.
25. Research Students in History. University of Stirling [Электронны рэсурс] // University of Stirling. Faculty of Arts and Humanities. Department of History and Politics. – Рэжым доступу: http://www.stir.ac.uk/arts-humanities/research/phdstudents/. – Дата доступу: 02.07.2017.
26. The Department of History and Welsh History. Postgraduate Handbook 2016–2017 / Aberystwyth University, Department of History and Welsh History, 2017. – 42 p.
27. The Scottish Credit and Qualifications Framework [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.scqf.org.uk/framework-diagram/Framework.htm. – Дата доступу: 07.07.2017.

*Паступіў 07.05.2018*

## FEATURES OF THE PhD – STUDENTS-HISTORIANS' PROFESSIONAL TRAINING AT THE SCOTTISH AND WELSH UNIVERSITIES AT THE BEGINNING OF THE XXIst CENTURY

***A. DENISEVICH***

*The article considers the features preparation of doctors in the field of history at the Scottish and Welsh universities. The main research directions of the Scottish and Welsh doctors-students-historians at the beginning of the XXIst century are described.*

***Keywords**: history, historical education, Bologna process, Doctor degree education, universities, Wales, Scotland.*